ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 148 (1113) | СУБОТА, 28-га чэрвеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Сёньня а 12-й гадзіне ганцы фабрык, заводаў, колгасаў і савгасаў БССР павязуць рапарты перамог і дасягненьняў вышэйшаму гаспадару партыі—XVI-му партзьезду

XVI ЗЬЕЗД УсеКП(б)

Новымі гігантамі індустрыі, шырокім размахам колектывізацыі, фабрыкамі хлеба, перадачай тысяч лепшых рабочых у партыю, магутнай хваляй соцспаборніцтва і ўдарніцтва, высокімі якаснымі паказчыкамі—

вітаюць XVI зьезд і дэмонструюць сваё давер'е бальшавіцкай партыі, яе ленінскаму ЦК мільёнфныя калёны пролетарыяту, колгасьнікаў і працоўнага сялянства

Прамова тав. Калініна

Таварышы! Ад імя Цэнтральнага Камітэту вітаю дэлегатаў XVI зьезду Ўсесаюзнай Комуністычнай Партыі (бальшавікоў).

Пасьля XV зьезду нашай партыі прашло ня многа больш 2 з пал. год. Можна сьмела сказаць, што мінулы пэрыод быў запоўнены вялізарным рэволюцыйным зьместам і і нябачанай творчай работай. За гэтыя гады, як ніколі, разгарнулася соцыялістычнае будаўніцтва. Я ня маю магчымасьці дэтальна спыніцца на выніках гэтага будаўніцтва, але ў гэтым бадай і няма асаблівай неабходнасьці, бо ў гэтай залі вы заслухаеце аднаведны даклад генэральнага сакратара нашай партыі т. Сталіна, дзе будзе поўнасьцю разгорнуты малюнак нашых дасягненьняў. Але я не памылюся, калі скажу, што работа, прароблепая народамі Савецкага Саюзу пад гегемоніяй пролетарыяту і кіраўніцтвам комуністычнай партыі, вялізарна па сваіх маштабах і надзвычай выразна па сваіх якасных паказальніках.

Таварышы, калі ўглядзецца ў калейдоскоп перажываемага моманту, дык мімавольна напрашваецца параўнаньне цяперашняй сапраўднасьці з мінулымі гістарычнымі момантамі, бо гэтым параўнаньнем лепей можна зразумець, уразумець і ахапіць сутнасьць падзей, якія разгортваюцца.

Са ўсёй сумы важнейшых пытаньняў, якія будуць абгавораны на зьезьдзе, я хачу вылучыць адно, з майго пункту погляду, рашаючае політычнае пытаньне сучаснасьці, а іменна—пытаньне аб соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі. У 1921 годзе, пры ўвядзеньні нэпу, Ленін гаварыў: „мы зараз адступаем, каб потым з разьбегу кінуцца яшчэ далей уперад па шляху соцыялістычнага будаўніцтва". Вось цяпер, таварышы, якраз і наступіў такі момант, калі матэр'яльна-тэхнічныя рэсурсы, накопленыя буйной прамысловасьцю, далі магчымасьць комуністычнай партыі і пролетарыяту непасрэдна ажыцьцявіць гэты разьбег. Дзякуючы гэтаму цяпер мы падышлі да вырашэньня проблемы разьвіцьця сельскае гаспадаркі ўжо зусім з іншага боку.

Калі ў пачатку новай экапамічнай політыкі мы стараліся ў першую чаргу паднімаць дробную сялянскую гаспадарку, каб такім шляхам адрадзіць і паднясьць буйную гаспадарчую прамысловасьць, дык цяпер прамысловасьць, якая бурна разьвіваецца, паварочваецца тварам да сельскае гаспадаркі і кідае свае накопленыя рэсурсы для таго, каб перабудаваць сельскую гаспадарку на пачатках буйной колектывізаванай вытворчасьці. Цяпер наша задача зусім ня зводзіцца да таго, каб проста падняць сельскую гаспадарку. Не. Тут справа ня ў гэтым. Зараз сапраўдны ўздым прадукцыйнасьці сельскае гаспадаркі немысьлімы без карэннага перетварэньня вёскі, з якім зьвязана глыбокая соцыяльна-культурная перабудова сельска-гаспадарчых вытворцаў.

Таварышы, калі-б мы пажадалі зараз абагуліць і коратка выказаць тыя вынікі соцыялістычнага будаўніцтва за апошнія 2 з пал. гады, дык мне здаецца, што не знайсьці найбольш правільнай, найбольш выразнай формы выяўленьня гэтых посьпехаў, чым лёзунг, які быў упяршыню высунуты т. Сталіным



на конфэрэнцыі аграрнікаў-марксыстых, г. зн. лёзунг аб суцэльнай колектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Мне здаецца, што гэты лёзунг яшчэ ня зусім пераварены ўсімі працоўнымі нашага Саюзу, але ён яшчэ нават поўнасьцю не пераварапы шырокімі пластамі нашае партыі. А між тым, таварышы, гэты лёзунг зьяўляецца самым выразным паказальнікам нашых дасягненьняў. Праўда, сёньня ён больш зразумелы, больш органічна зьвязаны з нашай політыкай, з практычнымі работамі, чым гэта было ўчора. Заўтра гэты лёзунг яшчэ мацней укараніцца ў галавы практычных работнікаў, бо соцыялістычнае будаўніцтва, якое разьвіваецца кожны дзень, падмацоўвае конкрэтнымі фактамі ўсю жыцьцёвасьць і неабходнасьць гэтага лёзунгу.

Таварышы, што значыць суцэльная колектывізацыя? Гэта значыць, што шматмільёвныя распыленыя, дробныя тавара-вытворцы, дробныя гаспадарчыкі далучаюцца да актыўнага соцыялістычнага будаўніцтва. Гэта значыць, што да шматмільённай пролетарскай арміі соцыялістычных будаўнікоў далучаюцца дзесяткі мільёнаў будаўнікоў-сялян. А напошце, гэта азначае набліжэньне моманту поўнага зьнішчэньня антыкапіталістычных клясаў, наступовага зжываньня клясавай барацьбы праз зьнішчэньне кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі.

Мы яшчэ ня зусім усьвядомілі вялізарную творчую сілу гэтага лёзунгу. Бо гэта-ж ёсьць самае рэльефнае і конкрэтнае выяўленьне магутнасьці нашай прамысловасьці, якое рухае і вядзе ўперад пераможны пролетарыят. І недарма таму ўвесь сьвет з выключнай зацікаўленасьцю сачыць за колектывізацыяй сельскае гаспадаркі, якая розгортваецца ў нас.

Таварышы, калі Ленін высоўваў тое або іншае політычнае пытаньне, дык ён звычайна папераджаў, што пытаньне пастаўлена на лязо нажа, што ўхіліцца ад правільнага вырашэньня гэтага пытаньня, нават у нязначнай ступені, значыць зрабіць грубейшую памылку. І ў сучасны момант лёзунг „Суцэльная колектывізацыя сельскае гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як клясы"—г. зн. што ў політычных адносінах пытаньне пастаўлена на лязо нажа. Таму ад выканаўцаў іх патрабуецца глыбокае разуменьне ўнутранога сэнсу гэтага лёзунгу. Самае нязначнае незразуменьне гэтага лёзунгу цягне да перагібаў, скажэньняў і пазбаўляе нас магчымасьці атрымаць той вынік, які праськедуецца гэтым лёзунгам.

Калі можна так сказаць, гэтым лёзунгам проста непасрэдна наша партыя пастаўлена перад гіганцкай задачай сапраўднага соцыялістычнага будаўніцтва са ўсім уздымам вялізарнейшых труднасьцяй, якія нясе ў сабе гэтая гістарычная работа таму ня дзіва, што на глебе практычных цяжкасьцяй чутны асобныя галасы, у якіх адчуваецца бязьсілівасьць гэтых цяжкасьцяй, якія шарохаюцца перад намі то ўправа, то, „ўлева". Партыя рашуча змагаецца з гэтым шарэханьнем. Я не сумняваюся, што зьезд пакончыць з такімі хістаньнямі.

Няхай жыве пераможнае соцыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве Ўсесаюзная комуністычная партыя бальшавікоў і яе XVI зьезд!

Абвяшчаю XVI зьезд партыі адкрытым (доўгія воплескі—усе дэлегаты ўстаюць і пяюць Інтэрнацыянал).

ВЫБАРЫ КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ ЗЬЕЗДУ

Пасьля прамовы тав. Калініна зьезд прыступіў да выбараў кіруючых органаў. У прэзыдыум абіраюць 40 чалавек. Пры агалашэньні імя тав. Сталіна уся заля ўстае. Дэлегаты, стоячы, наладжваюць бурную авацыю.

У склад прэзыдыуму ўвайшлі: Акулаў, Андрэяў, Арцюхіна, Варэйкіс, Варашылаў, Гей, Галашчокін, Зяленскі, Жданаў, Кабакоў, Кагановіч, Калінін, Калыгіна, Кіраў, Калацілаў, Касіор, Станіслаў, Косараў, Куйбышаў, Ломіназэ, Мануільскі, Мікаян, Молатаў, Нікалаева, Орджанікідзе, Пятроўскі, Румянцаў, Рудзутак, Рыкаў, Сталін, Сырцоў, Томскі, Ухапаў, Хатаевіч, Чубар, Шварнік, Шэбалдаеў, Шкіратаў, Якаўлеў, Яраслаўскі, Эйха.

У ганаровы прэзыдыум зьезду абіраюцца прадстаўнікі зарубежных компартый.

Зьезд выбірае сэкратарыят у складзе 26 чалавек і мандатную камісію.

Члены прэзыдыуму займаюць месцы. Зьяўленьне тав. Сталіна за сталом прэзыдыуму сустракаецца бурнай доўгай авацыяй. Заля агалашаецца прывітаньнямі і гучнымі аплёдысмэнтамі.

Зьезд зацьвярджае наступны парадак дня:

1. Політычная справаздача ЦК. 2. Організацыйная справаздача ЦК, 3. Справаздача рэвізыйнай камісіі, 4. Справаздача ЦКК, 5. Справаздача дэлегацыі УсеКП(б) у ВККІ, 6. Выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці, 7. Колгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі, 8. Задачы профсаюзаў у рэконструкцыйны пэрыод, 9. Выбары цэнтральных установаў партыі.

Рабочыя дэлегацыі вітаюць зьезд і патрабуюць непрымірымай барацьбы з ухіламі

Ад імя Далёка-Усходняй—на трыбуне тав. Блюхер

Далей тав. Калінін паведамляе аб тым, што прадстаўнікі рабочых дэмонстрацый, якія прышлі вітаць зьезд, і прадстаўнікі рабочых дэлегацый Масквы і другіх гарадоў просяць слова. Усе выступаючыя прадстаўнікі рабочых заяўляюць аб поўным падтрыманьні генэральнай лініі партыі і патрабуюць далейшай непрымірымай барацьбы з найбольш небясьпечным зараз правым ухілам і „левым!" загібамі.

Громам аплёдысмэнтаў сустракае зьезд прадстаўнікоў 900 тысяч колгасьнікаў Паўночнага Каўказу і прадстаўнікоў ударнага колгасу „Ленінскі Шлях". Колгасьнікі паведамляюць аб сваіх вытворчых дасягненьнях і аб тэй напружанай клясавай барацьбе, у якой праходзіць соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі.

Бурную авацыю наладжвае зьезд тав. Блюхеру, які выступае з прывітаньнем ад рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. „Армія політычна вырасла і тэхнічна ўзмацнілася,—гаворыць тав. Блюхер.—Пасьля вымушанай сутычкі на кітайскай граніцы мы можам сьмела гаварыць, што падрыхтоўка Чырвонай арміі не ўступае падрыхтоўцы арміі любой буржуазнай краіны. Чырвоная армія непахісна стаіць на варце савецкіх межаў і здоле адбіць любы напад на СССР, адкуль-бы ён ні выходзіў".

Тав. Блюхер, прадстаўнік асобай Далёка-Усходняй чырвонаштандартнай Чырвонай арміі, прадстаўнік Чырвонаштандартнага бальтфлёту,—усе яны гавораць зьезду, што партыйныя організацыі Чырвонай арміі і чырвонага флёту і ўся чырвонаармейская і чырвонафлёцкая маса цалкам і поўнасьцю падтрымліваюць генэральную лінію партыі і патрабуюць рашучай барацьбы з найбольш небясьпечным зараз правым опортунізмам і левымі загібамі.

Прывітаньні скончаны. Тав. Калінін абвяшчае пасяджэньне зачыненым. 27 чэрвеня з 10 гадзіне раніцы зьезд прыступае да заслухоўваньня дакладу політычнай справаздачы Цэнтральнага Камітэту, якую зробіць тав. Сталін.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

МАСКВА, 27-VI. З політсправаздачай ЦК выступіў генэральны сэкратар ЦК тав. СТАЛІН. Паяўленьне тав. СТАЛІНА на трыбуне спатыкаецца доўгай авацыяй. Увесь зьезд стоячы доўгімі воплескамі вітае правадыра партыі.

Дзённае пасяджэньне а 5 гадзіне было прысьвечана пытаньням міжнароднага і ўнутранага становішча СССР.

Заключная частка дакладу тав. СТАЛІНА, прысьвечаная пытаньням партыі, заняла ўсё вячэрняе пасяджэньне. Даклад быў заслухан з непаслабнай увагай і неаднакроць спыняўся воплескамі.

Па скончэньні дакладу ўсе дэлегаты зьезду ўстаюць і наладжваюць тав. СТАЛІНУ доўгую бурную авацыю. 28-га чэрвеня пасяджэньне адчыняецца а 10 гадзіне раніцы з організацыйнай справаздачы ЦК. З дакладам выступіць тав. КАГАНОВІЧ.

200 лепшых ударнікаў у шэрагі ленінскай партыі

АРХАНГЕЛЬСК, 26.—Рабочыя фабрыкі „Сокал" і Сьвярдлоўскага цэлюлёзнага заводу ў якасьці падарунку 16-му партзьезду абвясьцілі свае заводы ўдарнымі. Рабочыя абяцаюць даць краіне звыш пляну 7.345 тон цэлюлёзы. У шэрагі ленінскай партыі рабочыя перадаюць 200 лепшых ударнікаў.

ФАШЫСЦКІЯ КАТЫ ПРЫГАТАВАЛІ ЯШЧЭ ТРЫ ШЫБЕНІЦЫ

Польскі фашысцкі суд ва Львове за распаўсюджваньне комуністычнай адозвы прыгаварыў трох маладых таварышоў—ПРОПЭРА, ГІРША і ЮГЭНДА—да сьмяротнага пакараньня

Спаянай рэволюцыйнай солідарнасьцю, мільёнымі протэстамі працоўныя масы Савецкай Беларусі патрабуюць скасаваньня катаўскага прыгавору над рэволюцыянэрамі

Прыгавор суда ёсьць адказ на ўзрастаючы рэволюцыйны рух, ёсьць спроба прыгатаваць „пакорлівы" тыл і стварыць умовы для нападу на СССР

Яшчэ адзін крывавы прысуд

Польскі фашысцкі суд у Львове вынес прыгавор пакараньня сьмерцю трох маладых таварышоў—**Пропэра, Югэнда і Гірша**—за пашырэньне комуністычнай адозвы і прыналежнасьць да комуністых.

Гэта яшчэ адзін крывавы прысуд фашысцкіх вешацеляў, ён лішні раз пацьвярджае, што фашысцкая дыктатура ў Польшчы, у час паглыбляючагася крызісу і росту рэволюцыйнага руху сярод рабочых, сялянскіх мас і прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў, страшэнна ўзмацняе тэрор супроць малейшых рэволюцыйных выступленьняў.

Польскі імпэрыялізм на чале з фашысцкай дзяржавай, падтрымліваючы і распальваючы ўсякія антысавецкія выпады, рыхтуе **ўнутраны „пакорлівы" тыл пры дапамозе шыбеніцы, турмы і расстрэлаў, каб забясьпечыць магчымасьць нападу на краіну пролетарскай дыктатуры—СССР.**

Але гэта дарэмныя патугі ашалелых паноў.

Ніякія шыбеніцы ня здольны прыдушыць рэволюцыю. Крывавы прыгавор над трымя таварышамі выклікаў **глыбокае абурэньне сярод шырокіх працоўных мас Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны, якія пад кіраўніцтвам сваёй компартыі заяўляюць катэгорычны рэволюцыйны** протэст супроць сьмяротнага прысуду.

Працоўныя масы **БССР** мільёнамі протэстуючых галасоў падтрымліваюць барацьбу працоўных мас Польшчы і патрабуюць неадкладнага скасаваньня крывавага прыгавору.

Спаяныя пролетарскай солідарнасьцю шырокіх працоўных мас мільённымі протэстамі не дамо апусьціць прыгатаваную крывавай рукою польскіх фашысцкіх катаў пятлю на галавы Гірша, Югэнда і Пропэра.

Не дапусьцім закінуць вяроўку на шыю змагаром

Пашыранае пасяджэньне Менскага акруговага камітэту МОПР'у заслухаўшы інфармацыю аб прысудзе фашысцкага суду у Львове да кары сьмерцю праз павешаньне трох маладых рэвалюцыянэраў Гірша, Югэнда і Пропэра, якія абвінавачаны ў пашырэньні комуністычнай літаратуры і ў прыналежнасьці да комуністычнай партыі, ад імя ўсёй акруговай організацыі МОПР'у выказвае сваё глыбокае абурэньне і пратэст супроць фашысцкіх катаў-вешацеляў!

Менскі акруговы камітэт МОПР'у заклікае ўсе арганізацыі Менскай акругі—райкомы і ячэйкі да пратэсту супроць такога нячуванага зладзейскага акту фашысцкай „юстыцыі".

Не дапусьцім закінуць вяроўку на шыю змагаром.

Прэч белы фашысцкі тэрор!

Шлем гарачае прывітаньне палітзьняволеным Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.



Твар фашысцкай дыктатуры ў Польшчы

Усе, як адзін,—на ратаваньне жыцьця прыгавораных таварышоў!

Заслухаўшы інформацыю аб зьверскім прыгаворы польскага фашысцкага суду над трыма таварышамі: Пропэрам, Югэндам і Гіршам, агульны сход членаў МОПР'у фабрыкі „Профінтэрн" і гаркомбінату (Менск) катэгорычна протэстуе супроць нячуванага барбарскага прыгавору польскага суда над трыма таварышамі.

Сход заяўляе, што наперакор фашысцкаму тэрору мы яшчэ больш згуртуем шэрагі МОПР'у і ўзмацнім братэрскую дапамогу рэволюцыянэрам. На прыгавор фашысцкага суда рабочая кляса яшчэ больш зьядноецца вакол Комінтэрну.

Далоў польскі фашызм!

Усе, як адзін,—на ратаваньне жыцьця прыгавораных таварышоў!

2 лісты з-за кратаў польскай турмы

„Паднясеце вялікую, як Монблян, дулю ўсяму „цывілізаванаму" сьвету"

„Мы добра ведаем чаму зараз так заварушыўся фашызм і таму мы вышэй паднімаем галаву, бо воля ўжо заглядае нам у вочы"

Усе тыя, хто асьмельваецца адкрыта протэставаць супроць капіталістычнага прыгнечаньня, хто сьмела заяўляе аб драпежніцтве паноў, хто ўзьнімае свой голас супроць бясчыннай фашысцкай паліцыі, хто зацісьнуты ў імпэрыялістычныя кіпцюры, заяўляе аб сваім праве на жыцьцё,—усе яны, за адзін сьмелы голас, саджаюцца на доўгія гады ў турмы. Прадбачачы сваю блізкую пагібель, фашысцкія маршалы праз кліку вымуштраваных поліцэйскіх, ваенна-палявымі судамі, растрэламі, турмам, кроўю працоўных,—імкнуцца загасіць рэволюцыйнае полымя, якое усё больш разгараецца. **Але не,—ім гэта ня ўдасца! «Чым горш,—тым лепш!»**

Лепшым паказчыкам тэй рэволюцыйнай палкасьці, клясавай нянавісьці, бальшавіцкай стойкасьці, упэўненасьці ў перамогу, якімі праняты сотні і тысячы рэволюцыйных барацьбітоў, зьяўляецца ліст комсамолкі, якая ўжо доўгія гады знаходзіцца за кратамі польскай фашысцкай турмы.

Пагрозы „задушыць, замучыць у карцэры" не загасяць рэволюцыйнага агня. Нашы браты па класе, знаходзячыся ў капіталісьцычнай турме, ведаюць, што капіталістычны „мур"—труха, гнільлё, якое дажывае апошнія часы.

Лісты комсамолак палітвязьнярак, якія мы зьмяшчаем, поўны бадзёрасьці, упэўненасьці ў перамогу, зьяўляюцца лепшым прыкладам рэволюцыйнай непахіснасьці на прыкладах якое масы комсамольцаў і працоўнай моладзі павінны вучыцца, як ненавідзець клясавага ворага і, перамагаючы ўсе перашкоды і цяжкасьці, упэўнена ісьці да канчатковай мэты—перамогі соцыялізму ва ўсім сьвеце.

Мілая Хрысьця, нашы любыя таварышкі комунаркі!

Другі ваш ліст прынёс нам таксама многа радасьці. Нецярпліва чакаем новых вестак ад вас, хочам ведаць, як правялі сяўбу, ці многа засеялі, як працуюць тыя таварышы, што ўліліся да вас? Каб вы ведалі, як усё гэта нас цікавіць, колькі мы думаем, гаворым аб вашым жыцьці, як моцна жадаем, каб у вас праца ішла найлепей.

Вельмі мы зацікавіліся вашым паведамленьнем аб інкубатары. Мае таварышкі пыталіся, а колькі часу патрабуецца, каб інкубатар „высядзеў" куранят—больш за квактуху?! яшчэ: куды хаваюцца малыя куранякі, як іх пільнаваць, карміць? Як гэта добра, што вашы дзеткі будуць у яслях і на пляцоўцы пад наглядам. Шчасьлівыя гэтыя дзеткі, а колькі мільёнаў дзяцей у замежных краінах жывуць зусім па інакшаму, чым вашы маленькія комунары. Усім ім мы таксама шлем палкае прывітаньне.

Мілыя таварышкі комунаркі! Цяпер я вам крыху раскажу аб нашым жыцьці ў вастрозе. У нас таксама робіцца „ўсё больш", але гэта ня радасна. Год таму назад было тут у нас політычных вязьнярак толькі шэсьць, а зараз...—а зараз у пяць раз болей, а на волю за гэты час выпусьцілі толькі дзьвюх. Прысуды ўсім: чатыры, шэсьць, восем, дзесяць гадоў. Такім чынам, як бачыце, можна нават забыцца, як вольны сьвет выглядае. Шмат сярод нас хворых, ды і ня дзіва, бо ўсе мы прашлі праз некалькі галадовак, катаваньняў і іншых здарэньняў. І таму, здаровым застацца было немагчыма. Сваякоў нашых і таварышоў мы ніколі ня бачым, бо турма наша знаходзіцца ў далёкім глухім кутку Польшчы, куды даехаць дорага каштуе, а якое багацьце ў нашых сваякоў—рабочых і сялян—вам добра вядома.

Асаблівая галыцьба пануе цяпер, калі ў Польшчы беспрацоўе. Вы, мае родныя, даўно ўжо праміналі такія часы, а рабочыя і сяляне капіталістычных краін зараз церпяць усю гэту накуту, калі брат забівае брата за кавалак селядца (такі выпадак баў пядаўна ў Чэнстахове), калі людзі падаюць на вуліцах. Зразумела, што працоўныя ня зносяць усяго гэтага цярпліва. Кожны дзень у розных гарадох адбываюцца дэмонстрацыі, бойкі з паліцыяй, кожны дзень праліваецца кроў рабочых і сялян, каб назаўтра змагацца зноў, з яшчэ большай энэргіяй і сілай.

Набліжаецца рэволюцыя ў Польшчы, ідзе і да нас Вялікі Кастрычнік. Чуе гэта фашызм і ўсё мацней куе свае ланцугі. Але больш дастаецца, вядома, тым, каго ўжо ён трымае ў сваіх крывавых кіпцюрох, г. зн. нам—політычным вязьням. **Жыцьцё наша пагаршаецца з кожным днём. Хочуць нас так задушыць, каб мы і ня дыхалі, але нас задушыць зусім ня так лёгка.** Ого,—нас голай рукою ня возьмеш, бо апячэшся! Ведаем добра і мы, чаму гэта цяпер заварушыліся фашысты, і ўсё вышэй падымаем мы галавы, **бо воля ўжо нам заглядае ў вочы.**

Таварышкі мілыя! Каб вы ведалі што гэта за шчасьце вялізарнае гэта ведаць, так думаць, аб гэтым пісаць. Уявеце толькі сабе на хвілiначку, што гэта азначае жыць у турме напярэдадні рэволюцыі! І для гэтага ў нас столькі бадзёрасьці, столькі сілы, што хапіла-б перанесьці яшчэ ў тры разы столькі розных зьдзекаў! Для гэтага мы з захапленьнем прымаем ваша запрашэньне прыехаць да вас. Але таварышкі мілыя, мы зараз прыйдзем да вас вучыцца, як будаваць новае жыцьцё, як ствараць соцыялістычную вёску, а вы прыедзеце да нас у савецкую Польшчу, каб кіраваць, дзяліцца вопытам, дапамагаць вам. **Усё гэта будзе, а пакуль што будзем зьбіраць сілы для рашучага бою. Вы, дарагія, працуйце і ведайце, што покуль што такія шчасьлівыя на ўсім сьвеце толькі адны вы!**

Ну, бывайце здаровыя і вясёлыя Моцна вас цалуем.

Політычныя вязьняркі польскай турмы

Любыя мае, Варвара і Міхась!

Сёньня напішу вам аб тым, аб чым пісаць забаронена нам. За адно слова, за якое конфіскуюць шмат лістоў.

Дык вось: ва ўсіх турмах перажылі мы „рэволюцыю". Нашы фашыстоўскія апякуны ўзяліся рашуча зьнішчыць „комуну"—бальшавізм. Забралі ў нас усе бальшавіцкія кніжкі (г. зн. выданьні СССР), забаранілі перадаваць з камеры ў камеру, забаранілі зьбірацца на шпацыр, забаранілі нават перадаваць адна другой газэты. Усё гэта для таго, каб ня даць магчымасьці вучыцца. Апрача таго, **„ня ладзь комуну"—грозна абвясьцілі нам г. зн.—купляць продукты, кожны павінен толькі для сябе, хто атрымлівае пасылку, той і есьць. А купіць дазволена ня больш, як сам можаш зьесьці.** Да ўсяго гэтага яшчэ з дзесятак дэкрэтаў у тым самым кірунку. У Вронках нават спрабавалі сілком пераапрануць нашых таварышоў у крымінальную вопратку, збрыць валасы.

Гэта пачатак, а там—гэць на працу ў турэмныя майстэрні. Так хочуць яны. Але зусім іншага хочам мы. Дык вось і вайна. Са скуры вылазяць яны ад злосьці, што мы ня толькі схіляем пакорліва головы, але на кожным кроку пачынаем барацьбу. **„Я вас задушу, я вас у карцыры згнаю, вы будзеце ў мяне пад нагамі ляжаць і прасіць літасьці,—грыміць пан начальнік.** А назаўтра пачынае іншым способам: „Будзьце-ж вы разумнымі. Ці-ж галавою мур прашыбеш? Што-ж вы зробіце, вы—кабеты, супроць улады? Трэба пакарыцца. Трэба падобраму" і г. д. А калі і гэта не дапамагае,—выступае „вышэйшая ўлада"—прокурор і так нам заяўляе: **„з вамі трэба было так пастулаць, як вы з намі ў Расіі паступалі. Трэба было вас пад сьцяну паставіць, а ня трымаць у вастрогах, вы павінны быць удзячны, што ня толькі на сьвеце жывеце, але трымаецеся ў такіх варунках. А вы яшчэ хочаце ў культур-**

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, з жалезнай настойлівасьцю, з ленінскай мэтаімкнёнасьцю комсамол і надалей будзе змагацца на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва

А. КОСАРАЎ

ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ ДА XVI ЗЬЕЗДУ

Да 16 зьезду УсеКП(б) ленінскі комсамол прыходзіць загартаваным у барацьбе з правым опортунізмам і „левымі“ загібамі яшчэ больш зьядначым, спаяным навакол бальшавіцкага ЦК УсеКП(б), навакол генэральнай лініі партыі

Асноўная задача УсеЛКСМ у рэконструкцыйны пэрыяд зьяўляецца ў тым, каб няязьмерна больш пашырыць фронт свайго ўдзелу ва ўсім гаспадарчым грамадзка-палітычным і культурным жыцьці краіны. Узмацніць сваю дапамогу бальшавіцкай партыі, разам з ёю пад яе кіраўніцтвам змагацца і біцца з жалезнай настойлівасьцю, з ленінскай мэтаімкнёнасьцю на ўсіх тых вучастках, дзе будуецца соцыялізм,—такая програма комсамолу на сёньнешні дзень.

У гэтай програме рашаючае месца належыць барацьбе з опортунізмам усіх масьцей. Правыя опортуністыя, якія зьяўляюцца ў дадзены момант галоўнай небясьпекай, як і ўсе мінулыя опозыцыі, імкнуцца супроцьпаставіць комсамол партыі. Пляцформа правых па комсамольскіх пытаньнях базуецца на тэзісе аб перавыхаваньні маладога кулака ў комсамоле. Правыя недаацэньваюць клясавых момантаў у рабоце УсеЛКСМ, разьвіваюць бяспрынцыпнае дзялецтва і зводзяць на нішто ролю рэволюцыйнай тэорыі. Правыя падмяняюць таксама лёзунг аб уцягненьні ўсёй батрацка-бядняцкай і лепшай часткі серадняцкай моладзі ў комсамол лёзунгам аб прыёме сялянскай моладзі наогул.

Громячы правы ўхіл, ленінскі комсамол, так-жа як і партыя, вытрымаў барацьбу з „левымі“ загібамі. Пляцдармам для сваіх атак на партыйную лінію „левыя“ абралі комсамольскі друк, у якім шэраг былых комсамольскіх работнікаў зрабіў спробу падправіць лінію партыі „зьлева“, чым спрыяў узмацненьню правага ўхілу. Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) ленінскаму комсамолу ўдалося выкрыць „левыя“ загібы перад комсамольскімі масамі і свачасова выправіць памылкі „Комсамольскай Праўды“.

К XVI зьезду УсеКП(б) ленінскі комсамол прыходзіць яшчэ больш зьядналым, яшчэ больш спаяным вакол бальшавіцкага ЦК усеКП(б), вакол генэральнай лініі УсеКП(б). Ленінскі комсамол і ў далейшым гатоў змагацца з усім юнацкім энтузіязмам за генэральную лінію бальшавіцкай партыі!

У гэты пэрыод ленінскі комсамол бліжэй усяго падышоў да ажыцьцяўленьня па завету Леніна таго, што „комуністычны саюз моладзі павінен быць ударнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву і пачын“ (прамова на III зьезьдзе РКСМ).

Апошні год быў „годам вялікага перасяленьня народаў“. У комсамольскія організацыі. На перамогу вузкіх месц у вытворчасьці (Донбас, лесазагатоўкі, новае будаўніцтва) было перакінута да 150000 комсамольцаў.

Вялікая роля ленінскага комсамолу і ў соцыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

У агульным за гэты пэрыод вясковыя атрады УсеЛКСМ класава загартаваліся, узмацніліся і вазмужалі, прайшлі вялікую школу барацьбы з кулацтвам.

Асноўны недахоп, які зараз кідаецца ў вочы ў комсамольскай рабоце, гэта—адставаньне ад узрастаючых тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Гэта адставаньне нярэдка прыводзіць да таго, што комсамольскія організацыі ня ўмеюць свачасова організацыйна замацаваць растучай актыўнасьці працоўнай моладзі, прычым у паасобных мясцох пазытычны рост саюзнага кіраўніцтва ніжэй росту мас.

Вось чаму далёка яшчэ не ажыцьцёўлен лёзунг VI зьезду УсеЛКСМ аб 100 проц. ахопе пролетарскай моладзі.

З стаячых перад ленінскім комсамолам проблем найбольш вялікую вастрыню набывае зараз проблема падрыхтоўкі кадраў. Рэконструкцыйны пэрыод паставіў гэтае пытаньне ва ўсю шырыню.

Вакол вырашэньня проблемы кадраў між комсамолам і паасобнымі гаспадарнікамі профэсыяналістымі адбываліся вялікія прынцыповыя спрэчкі.

Правыя опортуністыя ў пытаньнях падрыхтоўкі рабочых кадраў супроцьставяць лініі партыі і комсамолу сваю ўласную лінію, якая імкнецца перанесьці к нам капіталістычныя прынцыпы падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, як прыдаткаў к машыне (гасьцеўшчына).

Памылковыя ў таноўкі прыводзяць к таму, што людзі „прызнаюць“ ФЗВ асноўнай формай падрыхтоўкі толькі „тэорэтычна“, а практычна, у процівагу маючымся рашэньням партыі аб ФЗК, насмджаюць розныя каротка тэрміновыя формы ЦІП'у. Асабліва тут „стараецца“ Наркомпрацы СССР.

Патрабуецца чоткая прынцыпова правільная пастаноўка пытаньня аб падрыхтоўцы рабочых кадраў. Вымушаную, часова неабходную падрыхтоўку паасобных катэгорый рабочых пра кароткатэрміновыя формы навучэньня нельга ўводзіць у добрадзейніка, у сыстэму, якая б стала дзейнічаючай, як імкнуліся, і па гэты час імкнуцца, гэта зрабіць паасобныя таварышы.

Тым больш нельга дапусьціць падмен школ ФЗВ гэтымі каротка тэрміновымі формамі навучаньня.

2-я партнарада, якая нядаўна закончылася па пытаньню народнай адукацыі, асудзіла опортуністычныя тэндэнцыі правых і цалкам стала на пункце погляду комсамолу аб політэхнізацыі сярэдніх школ. Новае кіраўніцтва Наркомасьветы падтрымала пункт гледжаньня комсамолу.

* * *

З часу XV партзьезду кольні-небудзь прыкметных зрухаў у справе палепшаньня парткіраўніцтва на мясцох не адбылося, ня гледзячы на тое, што палепшыўся якасны склад парт'ядра ў комсамоле і некаторыя партыйныя камітэты сталі зьвяртаць пытаньням комсамолу больш увагі.

Задача партыйнага кіраўніцтва ў сучасны пэрыод заключаецца ў тым, каб, дапамагаючы праводзіць правільную палітычную лінію ў комсамоле, дапамагчы УсеЛКСМ хутчэй усвоіць тэмпы рэконструкцыі і аказацца на ўзроўні стаячых перад ім грандыёзных гаспадарча палітычных задач.

XVI зьезд УсеКП(б) у ліку іншых пытаньняў павінен будзе абгаварыць і пытаньне аб парткіраўніцтве. 2800000 маладых бальшавікоў і 4 мільёны піонэраў заслужваюць увагі XVI зьезду УсеКП(б).

Кляса супроць клясы

За зьняцьце забароны саюзу чырвоных франтавікоў

БЭРЛІН, 24. У сувязі з абгаварэньнем у рэйхстазе бюджэту міністэрства ўнутраных спраў было праведзена галасаваньне прапановы комфракцыі аб безадкладным зьняцьці забароны саюзу чырвоных франтавікоў. За зьняцьце забароны галасавалі толькі адны комуністыя. Астатнія партыі, уключаючы і соцыял-дэмократаў, галасавалі супроць.

Шматтысячныя дэмонстрацыі рэволюцыйных рабочых

БЭРЛІН. 26.—Ва ўсёй Рурскай вобласьці адбыліся шматтысячныя дэмонстрацыі рэволюцыйных рабочых супроць наступленьня прадпрадпрыемцаў на зарплату, за 7-гадзінны рабочы дзень, за павышэньне зарплаты, за баявы саюз з гарнякамі і беспрацоўнымі, за абвяшчэньне забастоўкі 1 ліпеня, калі ўступае ў сілу абвяшчэньне абавязковым трацейскага рашэньня для мэталёвай прамысловасьці паўночна-заходняга раёну.

Англія „разбройваецца“

ЛЁНДАН, 26.—У палаце вобшчын морскі міністр Аляксандр зачытаў урадавую програму морскага будаўніцтва на 1930 г. Програма прадугледжвае закладку трох крэйсэраў па 6.500 тон кожны, 9 зьнішчальнікаў, 9 падводных лодак і і 2 дапаможныя судны. Кошт гэтых суднаў складзе 9 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў, якія мяркуецца выдаткаваць на працягу трох год.

Соцыял-дэмократы цкуюць рэволюцыйную профопозыцыю

Напад паліцэйскіх на дэмонстрацыю рабочых

БЭРЛІН, 25. У Доптмундзе адбылося сьвята профсаюзаў. Толькі рэволюцыйная профопозыцыя выступіла на сьвяце з чырвонымі сьцягамі і рэволюцыйнымі лёзунгамі. Сэкратар СД профсаюзу нацкаваў на прыхільнікаў рэволюцыйнай профопозыцыі паліцыю. У выніку паліцэйскага нападу адна работніца цяжка ранена, 13 чалавек арыштаваны. Адведзеныя соцыял-демократамі ў паліцэй-прэзыдыум арыштаваныя былі жорстка зьбіты.

Узмацнілася рэволюцыйная дзейнасьць

ПЭЙПІН, 25. Мясцовы друк паведамляе, што рэволюцыйныя рабочыя організацыі пад кіраўніцтвам комуністых аднавілі энэргічную дзейнасьць у раёне Кайлянскіх капальняў. У раён капальняў накіравана брыгада шансійскіх войск.

най, гуманітарнай заходня-эўропэйскай Польшчы чытаць бальшавіцкія кніжкі, што?

Гэта адзін бок справы. А другі—на вуліцы. Ведаеце, напэўна, якая ў Польшчы зараз сытуацыя, і ня цяжка вам будзе зразумець, чаму гэта менавіта цяпер пасыпаліся на нас усе гэтыя „добрадзействы“.

Эх, вясёлыя часы цяпер у нас, мае родныя! І ў нас цяпер рашаючы час. **Мы толькі аднэй палавай душы рэагуем на ўсе падзеі сучаснага, бо ў турме. Другая палова—у будучыні, другая жыве тым, што няўхільна набліжаецца, ідзе.** Колькі планаў, захапленьняў, шчасьця, радасьці і і сілы, сілы! Але ня буду разьлівацца на гэтую тэму.

Паглядзім, а ляпей будзем рабіць. Будзем, будзем! Эх, ма...

Нядаўна атрымала ліст ад цябе, а ў ім ад **Міхася і Хрысьці.** Колькі думак выклікалі гэтыя лісты, як глыбока задумваюцца дзяўчаты над словамі Варвары: „Размеркавацца мільёны рук“, над словамі Міхася: зламалі тысячагодвія ўстоі старое вёскі, але трэба навучыцца па-новаму працаваць, на разваручаных трактарамі межах“.

Паднясеце-ж вялікую, як Монблян, дулю пад самы нос усяму цывілізаванаму сьвету, які прарочыў вам пагібель, які выў, крычаў, глушыў, што ня будзе абсеяна і паловы таго, што сеялі сяляне перад „паншчынай“, гэта значыць—перад колектывізацыяй.

Ці-ж праўда, што ўжо хутка будзе пабудаваны Асінбуд? Як гэта дзіўна. Памятую, першы раз, прачытаўшы пра Асінбуд, здавалася мне, што гэта плян далёкай—далёкай будучыні. А яно вось і ўжо рэчаіснасьць!

Пішэце толькі больш, даражэнькія! **Ведаеце, што тыя дні, калі мы атрымоўваем ад вас лісты—гэта радасьць і сьвяточныя дні.**

Ну і ўсяго. Будуйце яшчэ хутчэй і ведайце што будуеце таксама базу пад рэволюцыю ў Польшчы, а яна чакаць ня прымусіць. Згадваецеся? Ну і добра. Усе політвязьнаркі палка вітаюць вас.

БЕЗАДКЛАДНА УКЛЮЧАЙЦЕСЯ У БАЯВУЮ КАМПАНІЮ

Перавыбарчая кампанія фабзаўмясцкомаў у самым разгары. Ня ўключыліся ў кампанію комсамольскія організацыі

СТАЯЦЬ У БАКУ АД ПЕРАВЫБАРАЎ—ЗЛАЧЫННА. БЕЗАДКЛАДНА НАВЯРСТАЙЦЕ ЎПУШЧАНАЕ

Усім АК, РК і ячэйкам

Пошта-тэлеграма

Безадкладна выправіць памылкі!

Згодна вестак, якія паступаюць у ЦК, удзел комсамольскіх організацый у перавыбарах фабзавмясцкомаў нездавальняючы. Нават, як паведамляюць брыгадзіры ЦСПСБ, па Віцебску і Гомелю назіраюцца факты адкліканьня комсамольцаў з брыгад па самаправерцы работы фабзавмясцкомаў у зьвязку з пачаткам перавыбараў бюро ячэек ЛКСМБ.

Гэта зьяўляецца парушэньнем пастановы ЦК аб удзеле комсамолу ў перавыбарах фабзавмясцкомаў і ўвязцы праводзімых перавыбараў ячэек ЛКСМБ з перавыбарамі ФЗМ.

ЦК прапануе прыняць усе захады, каб забясьпечыць выкананьне пастановы бюро ЦК аб поўным і актыўным удзеле комсамолу ў перавыбарах фабзавмясцкомаў.

За сэкратара ЦК ЛКСМБ РАМІЗЭВІЧ.

НЕ НА ЧАЛЕ, А У ХВАСЬЦЕ МАС

плёўся мясцком Дзяржсьпірту

ЗАМЕСТ КІРАЎНІЦТВА КАМІСІЯМІ—КАЗЁННАЯ ПЕРАПІСКА, СОЦСПАБОРНІЦТВАМ КІРУЮЦЬ АДДЗЕЛЫ ТРЭСТУ?

„Чырвоная Зьмена“ ўжо зьмяшчала матар'ял лёгкай кавалерыі аб бязьдзейнасьці мясцкому Белдзяржсьпірту і аб тым, як старшыня мясцкому выгнаў кавалерыстых з габінэту. У „Зьвязьдзе“ пісалася аб тым, як мясцком правадзіў вярбоўку рахункаводаў у колгасы.

Саюз харчавікоў застаўся глухім і не зьвярнуў увагі на гэтыя факты. Парт'ячэйка таксама абмежавалася констатаваньнем дрэннага ўчынку з боку старшыні мясцкому тав. Сушкевіча (ён прагнаў лёгкіх кавалерыстых) на прыняўшы ніякіх захадаў. Толькі пасьля наляганьня ячэйкі комсамолу пар'тячэйкай была вылучана брыгада, якая ўзялася за праверку работы мясцкому.

Брыгадай парт'ячэйкі і самаправерачных брыгад, вылучаных у зьвязку з перавыбарчай кампаніяй, выяўлена, што мясцком не кіраваў працай камісій, не даваў ім конкрэтных наказаньняў у рабоце і не праводзіў работы па соцспаборніцтву і ўдарніцкаму руху.

На адным сходзе старшыня мясцкому тав. **Сушкевіч** шмат гаварыў аб соцспаборніцтве адзначаў недахопы гэтай работы мясцкому, але не супярэчыў супроць прыняцьця рэзолюцыі, якая не абавязвала займацца соцспаборніцтвам мясцком, а звальвала гэтую работу на комісіі трэсту!?

На працягу паўтара год мясцком ні разу не зрабіў справаздачы перад выбаршчыкамі. Нічога ня зроблена па выяўленьню профактыву, плян працы ня выконваўся. Ніякага жывога кіраўніцтва камісіямі і сэктарамі з боку мясцкому ня было. Затое была цыркулярщчына і пэцканьне паперы.

Вось вузор гэтай дзейнасьці.

Слухалі: аб соцспаборніцтве.

Ухвалілі: прапанаваць эканомкамісіі ў тыднёвы тэрмін прадставіць плян соцспаборніцтва згодна прапановы агульнага сходу трэсту.

Эканомкамісіі для выкананьня

Старшыня мясцкому—СУШКЕВІЧ.

Брыгада прызнала работу мясцкому **слабай.**

Брыгады ў сваіх прапановах азначалі бязьдзейнасьць мясцкому. Усталі на дыбы людзі з мясцкому. „Сьвятая тройца“: сябры партыі **Сушкевіч, Самойлаў, Кунцэвіч.** Тав, Самойлаў, каб апраўдаць бязьдзейнасьць мясцкому, пачаў спасылацца на адсутнасьць кіраўніцтва мясцкому з боку партыйнай ячэйкі. На крытыку работы мясцкому Самойлаў бюрократычна адказваў: што гэтых выступленьняў можна і ня слухаць.

Самакрытыка ў Дзяржсьпірце разгорнута слаба. Ад саюзу на перавыбарчым сходзе нікога ня было. Сярод значнай часткі супрацоўнікаў існуе думка, што калі выступіш супроць мясцкому, дык і пакоцішся (г. зн. на ніжэйшую пасаду, альбо зусім з установы).

Усё гэта гаворыць аб неаходнасьці аздараўленьня склаўшыхся абставін у Дзяржсьпірце.

„Л. К.“.

МОЛАДЗЬ НЕ АПОШНЯЯ

ЦП саюзу не дапамагала рабоце

Перавыбарчая кампанія фабзавкому і цэхавых профбюро на фабрыках „Чырвоная Бярэзіна“ і „Пролетарская Перамога“ ў Нова-Барысаве пачалася 15 чэрвеня. Комсамольскі калектыў па цэхах organізаваў маладзёжныя брыгады па праверцы работы фабкомаў.

Справаздачныя сходы моладзь наведвала на ўсе 100 процантаў, ня было ніводнага маладога рабочага ні работніцы, якія-б ня былі на справаздачным сходзе. Комсамольцы і моладзь актыўна абгаварвалі дзейнасьць завкому, асабліва крылі завком за яго ўдзел у падрыхтоўцы кадраў.

Перавыбарчая кампанія паказала, што з боку ЦП саюзу хэмікаў ніякага кіраўніцтва работай ня было. Гэтая-ж ацэнка датычыцца і прадстаўніка моладзі ў ЦП, які таксама ні разу ня быў на фабрыцы.

Колектыў наладзіў вечар моладзі, прысьвечаны перавыбарам. Вечар зьявіўся штуршком да яшчэ большага ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі і складаньні новага наказу завкому.

Цымкоўскі.

Злачынства ці нядбайнасьць?

На пабудове заводу „Комунар“ было разабрана 20 кубамэтраў фундаманту з тае прычыны, што не прадугледзелі пабудовы на гэтым месцы сутарэньня.

За гэта павінны адказаць тэхнічныя кіраўнікі пабудовы.

К.

Рыхтуемся да асеньняй сяўбы



На здымку: 1) ударная комсамольская брыгада ў колгасе XI гадавіны Кастрычніка (Жлобінскага р-ну, Бабруйскай акругі) у часе вясеньняга севу, 2 і 3) масавы выезд у поле на падрыхтоўцы глебы пад азімыя ў гэтым-жа колгасе

Лісты з шклозаводу „Кастрычнік“

„Дырыжыруюць аглобляй“ *)

(*Ад нашага спэцыяльнага корэспондэнта*)

Прапаўшая грамата

„Чырвоная Зьмена“ ўжо пісала аб наезьце „Лёгкай Кавалерыі“ на цэхі па пытаньнях давядзеньня прамфінпляваў да цэхаў і варштатаў. Але-ж заводакіраўніцтва лічыць ніжэй свайго гонару прыслухацца да прапаноў „Лёгкай Кавалерыі“.

На заводзе тры тыдні працаваў прадстаўнік ТНБ шклоаб'яднаньня па пытаньню давядзеньня прамфінпляну да варштата. Ён распрацаваў шмат калёнак лічбаў, таямніцы якіх мог-бы зразумець чалавек добра знаёмы з бухгальтэрыяй. Але-ж і гэты сурогат прамфінпляну недзе прапаў сярод папер заводакіраўніцтва. Патрабавалася ўмяшаньне партколектыву. Шмат часу і нэрваў прышлося патраціць на тое, каб давесьці, што двойчы два ёсьць чатыры, а ня пяць, што прамфінплян да цэху і варштата не даведзен, што тое, што вісіць па цэхах пад шыльдай прамфінпляну, ёсьць толькі нормы выпрацоўкі. Рабочыя і па сёньня ня ведаюць, ці хутка будзе прамфінплян даведзен да варштата. Запытайцеся аб гэтым у работнікаў заводакіраўніцтва і вы пачуеце традыцыйны адказ:—„Нехта, нешта, недзе робіць, а калі будзе гатова, хто яго ведае.“

Застаецца толькі напомніць каму гэта ведаць належыць, што партыя і ўрад патрабуюць прыцягненьня да адказнасьці тых, хто сваімі халатнымі адносінамі зрывае давядзеньне прамфінпляну да варштата. На шклозаводзе „Кастрычнік“ гэта пастанова яшчэ чакае свайго ажыцьцяўленьня, тым больш, што адміністратары заводу цьвёрдала а не жадаюць лічыцца з паказаньнямі партыі.

А вось адказ, які найбольш яскрава і поўна характэрызуе настроі і справы ў давядзеньні прамфінпляну да рабочых. Нам. дырэктар заводу—Трацяк —на прапанову аб устанаўленьні сталага тэрміну у давядзеньні прамфінпляну заявіў:—„У нас няма зараз часу і людзей, каб распрацоўваць прамфінплян“.

Трывожныя сыгналы

К XIII зьезду КП(б)Б рабочыя заводу рапартавалі аб становішчы заводу. Прымаючы рапарт, рабочыя далі абяцаньне зьезду партыі ліквідаваць усе меўшыяся прарывы, выканаць і перавыканаць прамфінплян. 81 рабочы абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XIII зьезду КП(б)Б.

Далей мітынгаў справа не кранулася. Завком, партколектыў нічога не зрабілі, каб ажыцьцявіць абяцаньні, даныя партзьезду.

На сёньняшні дзень на заводзе няма ўдарных тэмпаў работы, амаль няма сапраўдных ударнікаў. На 4-ай зьмене выдувальнага цэху толькі адзін майстар выканаў прамфінплян. Майстры выдувальнага цэху выконваюць свае нормы выпрацоўкі, але вялікі процант бою і тэхнікі зводзяць да зусім мізэрнай колькасьці ўсю выпрацоўку майстра.

Маленькі штрых. К першаму мая скончыла сваю працу часовая кантрольная камісія па абгляду выкананьня соцспаборніцтва, з таго часу прашло ўжо каля двох месяцаў а вынікі праверкі яшчэ не абгавораны сярод рабочых. І ці трэба яшчэ што небудзь дадаць да прыведзеных фактаў.

Малюнак і так досыць яскравы.

Капеечны аўторытэт

„Што рабіў завком? Работнікі завкому будуць абурацца, калі вы ім скажаце, што яны нічога не зрабілі.

Завком разглядаў вялікую колькасьць скарг і спраў. Работнікі завкому хадзілі вырашаць кухонныя справы, сваркі паміж рабочымі, іх жонкамі і дзецьмі. Завком хадзіў у амбулаторыю зрабіць пратэкцыю таму ці іншаму рабочаму, каб яму хутчэй аказалі мэд. дапамогу. Работнікі завкому хадзілі ў рабкооп правярыць чаму таму ці іншаму рабочаму ня выдалі крамніны. Работу завкому характарызуюць—дробязі. Завком праспаў політычна-гаспадарчыя пытаньні. Вырашэньня завкому чакалі і чакаюць вельмі балючыя пытаньні жыльлёвага будаўніцтва, якія хвалююць рабочых і аб якіх ня ведае завком.

Ня змогшы кіраваць рабочымі, завком сваёй работай тармазіў разгортваньне ініцыятывы рабочых, дакаціўшыся да дзялянцтва і опортунізму ў практычнай рабоце.

Сёлета складалі справаздачу завкому да перавыбараў, вярней кажучы,—узялі старую справаздачу, перапісалі яе, перамяніўшы толькі лічбы. Гэта якраз і характарызуе работу завкому. За мінулы год соцспаборніцтва, і ўдарніцтва ахапілі рабочых, стварыўшы вялізарны ўздым сярод іх, а завком стаяў у баку ад жыцьця, і таму ў яго справаздачу нельга было ўнесьці ніводнага пункту аб асноўных і важнейшых пытаньнях работы.

На чорную дошку

Сумныя і ганебныя вынікі працы завкому, а на заводзе часамі не прыкмячаюць ці ня хочуць прыкмеціць прорвы у якой зараз знаходзіцца завком. Летась завод быў занесен на чорную дошку. Зараз ёсьць такія-сякія думкі, што цяпер завод ужо не на чорнай дошцы. Гэтыя думкі шкодны, бо яны замазваюць сапраўднае становішча заводу. Падобныя думкі і гутаркі ёсьць, па-сутнасьці, глядзеньне на рэчаіснасьць праз гольтаўскія акуляры.

У тым, што завод знаходзіцца на чорнай дошцы няма ніякіх сумненьняў. Наадварот - апошнія паказчыкі яшчэ больш цягнуць завод у бяздоньне чорнай дошкі. Значную частку віны і адказнасьці за становішча заводу нясе на сабе заводзкая профорганізацыя.

* *
*

Чатыры разы ў суткі: а 6-ай гадзіне раніцы і дня, а 12-ай дня і ночы гудзіць гудок. Тады ў гуце наступае файер. Файер—гэта канец работы. Неабмежаваная часамі нясупынная стыхія гольта чакае свайго файера.

Алесь Ліпнёвы.

п. Елізава. Бабруйскай акругі шкло завод „Кастрычнік“.

*) Канец. Пач. гл. у № 147 „Ч.З.“

22 З'АГІТАВАЛІ 100!

У першай брыгадзе на Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы імя Клары Цэткін налічвалася толькі 22 чалавекі. Зараз, па прыкладу 22, армія ўдарнікаў вырасла да 100 чалавек.

Першымі застрэльшчыкамі пераходу на больш павялічаную колькасьць машын былі комсамолкі, сярод іх: Юшкоўская, Папова, Пястуновіч і інш. Росту ўдарных брыгад садзейнічаў прыклад самых ударнікаў і адпаведная работа заводзкіх організацый.

Ударніца.

Да ўборкі ўраджаю гатовы

Колгасы імя „16-ці партызан“ і „Праца“ Дукорскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну падрыхтаваліся да ўборкі ўраджаю. Жаткі, касілкі поўнасьцю адрамантаваны. Уся рабочая сіла ўлічана і пабіта на брыгады. Комсамольская ячэйка слаба ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю.

Ц. Лявіцкі.

ЛІНІЯ АДРЭЗУ

Талён райупаўнаважанага „Чырвонай Зьмены“

1. Прозьвішча, імя ________
2. Адрас ________
3. Назва РК ЛКСМБ ________
4. Колькасьць ячэек і комсамольцаў у раёне ________
5. Якой патрэбен рэкламны матар'ял і колькі ________

Выражы, наклей на паштовую картку і дашлі ў Выдавецтва „Чырвоная Зьмена“, Менск, Комсамольская 25.

Памятка юнкора

Рэдакцыя чакае матар'ялу па наступных пытаньнях:

1. Як праходзіць самаправерка.

2. Як праходзяць перавыбары бюро ячэек.

3. Як удзельнічаюць у гэтай працы юнкоры, „лёгкія кавалерысты“ і комсамольцы.

4. Які ўдзел прымаюць комсамольскія організацыі ў перавыбарах фабзавмясцкомаў.

Рэдакцыя

Аб рабоце ўдарнай брыгады белрадыёцэнтру

НОВУЮ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПЕСЬНЮ—У МАСЫ

БАРЫСАЎ, 21. Сёньня ўначы ўдарная брыгада Белрадыёцэнтру выяжджае з Барысава ў Воршу.

На Барысаўшчыне брыгада правяла 5 дзён. За гэты час брыгадай праведзена 5 концэртаў: два концэрты для рабочых барысаўскіх і нова-барысаўскіх прадпрыемстваў, адзін концэрт у колгасе, адзін концэрт у чырвонаармейскіх лягерах і „лекцыю-концэрт“, на якім з усэй масай чырвонаармейцаў развучаны новыя рэвалюцыйныя сьпевы Чырвонай арміі. Усе концэрты прайшлі з вялікім посьпехам. У перапынку паміж першым і другім аддзяленьнямі концэрту наладжваліся гутаркі, абмен думкамі, пытаньні і адказы паміж аўдыторыяй і брыгадай. Наогул, работу брыгады ў першым пункце свайго маршруту можна лічыць добрай, але яна магла быць яшчэ больш інтэнсыўнай, калі-б з боку некаторых організацый былі праяўлены больш сьвядомыя адносіны да популярызацыі беларускай культуры.

Трэба ўспомніць „паважаную“ работніцу тав. Энгліну (Полі прасьвет), якая сваё садзейнічаньне брыгадзе абмежавала тым, што напісала паперку „не супярэчу супроць наладжаньня концэрту“ і г. д. Райком КП(б)Б, куды зьвярнулася брыгада, таксама недаацаніў усяе важнасьці гэтае справы і не даў сваім працаўнікам на мясцох патрэбных паказаньняў. Дзякуючы гэтаму, некаторыя організатары клюбнай працы і культурнага абслугоўваньня рабочых даволі неахайна аднесьліся да брыгады. Гэта трэба ўлічыць, каб далей брыгада магла працаваць па-ўдарнаму. Усе сябры брыгады выяўляюць поўную гатоўнасьць праводзіць па два концэрты ў дзень (раніцою-чырвонаармейскай часьці, у поўдзень на прадпрыемстве і ўвечары ў рабочым клюбе, альбо ў тэатры).

Гэты энтузіязм ударнікаў-артыстых трэба карыстаць поўнасьцю тым болей, што першыя дні працы брыгады паказалі не добрую падрыхтаванасьць сур'ёзныя адносіны да сваёй працы, а таксама і тое, што працоўныя Беларусі ня ведаюць яшчэ новых рэволюцыйных колгасных сьпеваў.

Любан.

Вечар спайкі з чырвонафлётцамі

19-га чэрвеня ў гор. Віцебску адбыўся вечар спайкі комсамолу і рабочай моладзі з прыехаўшай камандай маракоў, якая ўдзельнічае у ўсесаюзным шлюпачным паходзе. Вечар прайшоў з вялікім уздымам. Было сабрана шляхам выклікаў каля 200 рублёў у фанд пабудовы падводнай лодкі імя комсамолу. Чырвонафлётцы запэўнівалі, што чырвоны флёт нязрушна стаіць і будзе стаяць па варце марскіх рубяжоў краіны соцыялізму.

Т. К.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

у Скрыгалаўскі дзяржаўны культур-тэхнікум, з 3-х гадовым тэрмінам навучаньня, па падрыхтоўцы аграномаў культурнікаў на 1930-31 навучальны год

1. У тэхнікум прымаюцца асобы ад 14 да 25 год, скончыўшыя (незалежна ад году сканчэньня) поўны курс 9 годкі, 2-й ступені, 2-хгадовых адукацыйных курсаў, 7-мігодкі, школы для дарослых узвышанага тыпу, школы сялянскай моладзі і профшколы на базе 4 годкі, пасьля 3-х год вытворчага стажу, і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.

Увага: вытрымаўшыя іспыты ў 1928-29 і 1929-30 годзе пры паступленьні аслабаняюцца ад іспытаў.

Прыём заяў пачынаецца з 1 ліпеня па 1 жніўня г. г.

2. Дакуманты прыкладаюцца ў арыгіналах, за выключэньнем вайсковых:

а) дакумант аб узросьце (мэтрыка);
б) аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын);
в) аб асьвеце;
г) дзьве фотографічныя карткі;
д) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя;
е) дакумант аб соцыяльным і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў пасьля рэволюцыі і да рэволюцыі;
ж) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў;
з) для сьлян—акладны ліст на 1929-30 год, а для саматужнікаў—патэнт;
і) анкету, пасьведчаную профэсыянальнымі або савецкімі організацыямі.

Увага: бланкі анкет затрабаваць з тэхнікуму.

к) паштовых марак на адказ на 30 кап.

3) Тэрмін іспытаў і залічэньня ўстанаўліваецца з 1-га па 10 жніўня.

Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка.

Заявы накіроўваць па адрасу: Скрыгалаў, Мазырскае акругі, Культуртэхнікум.

Дырэктар Тэхнікуму—Кура.

Паведамленьні

Менская Біржа Працы доводзіць да ведама ўсіх беспрацоўных, якія жадаюць ехаць у Ленінград на працу ў якасьці грузчыкаў, аб тым, што пасылкі ў Ленінград на гэту працу ня будзе і калі хто-небудзь з беспрацоўных паедзе, то яны ня будуць прыняты на вучот Ленінградскай біржай працы і пры звароце назад у Менск таксама ня будуць прыняты на вучот Біржы Працы.

Загадчык Біржы Працы. Смельц.
Сакратар Юшко.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 529